# *ФИЛОЛОГИЧЕСКИЕ НАУКИ*

## ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

# *PHILOLOGY*

## LITERARY STUDIES

УДК 821.161.3.09

**А. А. Бараноўскі,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь,
+375 (44) 479 15 70, baranouski.ales@gmail.com

### ПЕРЦЭПТЫЎНЫ СВЕТ І ФІЛАСОФІЯ БЫЦЦЯ Ў ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА ЧАРАУХІНА: АД МІФАПАЭТЫКІ ДА ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАЙ ЛІРЫКІ

Артыкул прысвечаны аналізу паэтычнай творчасці Уладзіміра Чараухіна, якая вылучаецца адметным спалучэннем перцэптыўнага светаўспрымання, глыбокай філасофскай рэфлексіі і арыгінальнага выкарыстання міфапаэтычных элементаў. Асноўная ўвага надаецца даследаванню фальклорных матываў, сінестэтычных вобразаў і экзістэнцыйных аспектаў яго лірыкі. Асэнсаванне асаблівасцей паэтычнай мовы і светабачання аўтара дазваляе выявіць яго ролю ў развіцці сучаснай беларускай літаратуры і ўзаемасувязь з нацыянальнай культурнай традыцыяй.

Таксама даследчык звяртае ўвагу на ТАТМІР — творчы тандэм Таццяны Дарошка і Уладзіміра Чараухіна, літаратурны феномен, які аб'ядноўвае ўнікальныя паэтычныя галасы ў адзіную мастацкую плынь. Іх сумесныя тэксты спалучаюць быццёвую філасофію і тонкі лірызм, даследуючы фундаментальныя пытанні чалавечага існавання. Не засталіся па-за ўвагай пісьменнікаў і творчыя эксперыменты, якія выяўляюцца як у формах, так і ў змесце іх твораў, спрыяючы пашырэнню межаў айчыннага прыгожага пісьменства.

**Ключавыя словы:** Уладзімір Чараухін; сучасная паэзія; перцэптыўны аспект; экзістэнцыйная лірыка; фальклорныя матывы; міфапаэтыка; сінестэзія; беларуская культура; дзіцячая паэзія; ТАТМІР.

Бібліягр.: 5 назваў.

**A. A. Baranovsky,** Ph. D. in Philology, Associate Professor
State Scientific Institution "Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus", 1 Surganova Str., build. 2, 220072 Minsk, the Republic of Belarus,
+375 (44) 479 15 70, baranouski.ales@gmail.com

### PERCEPTIVE WORLD AND PHILOSOPHY OF BEING IN THE POETRY OF VLADIMIR CHARAUKHIN: FROM MYTHOPOETHICS TO EXISTENTIAL LYRICS

The article is dedicated to analyzing the poetic works of Uladzimir Charaukhin, that are distinguished by a unique combination of perceptual worldview, profound philosophical reflection, and original use of mythopoetic elements. Particular attention is paid to the exploration of folkloric motifs, synesthetic imagery, and existential aspects of his poetry. The study of the author's poetic language and worldview reveals his role in the development of contemporary Belarusian literature and connection to the national cultural tradition.

The researcher also highlights TATMIR — a creative tandem of Tatsiana Daroshka and Uladzimir Charaukhin, a literary phenomenon that unites their unique poetic voices into a single artistic stream. Their collaborative texts blend existential philosophy with delicate lyricism, addressing fundamental questions of human existence. The writers' creative experiments in both form and content have not gone unnoticed, contributing to the expansion of the boundaries of Belarusian literature.

**Key words:** Vladimir Charaukhin; modern poetry; perceptual aspect; existential lyrics; folklore motifs; mythopoetics; synesthesia, Belarusian culture; children's poetry; TATMIR.

Ref.: 5 titles.

© Бараноўскі А. А., 2025

Рэпазіторый БарДУ

**Уводзіны.** Творчасць Уладзіміра Чараухіна — адметная з'ява сучаснай беларускай паэзіі — спалучае ў сабе філасофскую, этычную, эстэтычную праблематыку, характарызуецца шчырасцю, схільнасцю да эксперыментаў. Яна ахоплівае экзістэнцыйныя пытанні ўніверсума, прыналежнасці чалавека да часавых і прасторавых каардынат, скіроўвае да «вечных» катэгорый, што дазваляе разглядаць яго лірыку як сінтэз асабістага досведу і ўніверсальных тэм. Аўтар звяртаецца да чытача не з павучаннем, а з прапановай падумаць, прыслухацца да свайго ўнутранага голасу. Навізна даследавання заключаецца ў акцэнце на перцэптыўных механізмах стварэння вобразаў, якія размываюць межы паміж «унутраным» і «знешнім» космасамі праз сінестэтычнае ўспрыманне і выкарыстанне фальклорных матываў. У артыкуле вырашаецца задача выявіць падыходы У. Чараухіна да мастацкага ўвасаблення філасофскай рэфлексіі і пачуццёвага досведу.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання паслужылі зборнікі мастацкіх твораў, а таксама публікацыі аўтара ў перыядычным друку. Метадалогія даследавання адпавядае прынцыпам кантэкстнага, семантычнага, псіхалагічнага падыходаў, апісальнага і біяграфічнага метадаў.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Першая публікацыя Уладзіміра Чараухіна з'явілася ў друку ў 2006 годзе. З таго часу на яго творчым рахунку — шэраг публікацый у калектыўных зборніках «Пралеска» (2010), «Белакрылы птах» (2012), «Маладыя галасы» (2012), «Слово за словом» (2013) і інш., а таксама сумесныя з беларускай пісьменніцай Дар'яй Дарошка зборнікі «Не наступайте птице на крыло» (2010), «Маяк» (2014), «Альтанка» (2017). Шырокаму чытачу імя У. Чараухіна стала вядома найперш дзякуючы яго паэтычным падборкам у рэспубліканскім перыядычным друку: часопісах «Полымя», «Верасень», «Метамарфозы», газеце «Літаратура і мастацтва» і інш.

Перш чым голас маладога творцы набыў моц, адбылася вялікая праца над сабой і, без сумнення, над паэтычным радком. Гэтаму паспрыяла беларуская пісьменніца і перакладчык Ніна Шклярава, якая ў 2006-м — спярша на грамадскіх пачатках (пры Гомельскай спецыялізаванай славянскай бібліятэцы), а пасля на базе Гомельскага дзяржаўнага абласнога палаца творчасці дзяцей і моладзі (2009) — арганізавала Школу маладога літаратара, дзе і зрабіў першыя крокі будучы паэт. Натурфіласофская лірыка У. Чараухіна, якая стваралася на рускай і беларускай мовах, мела ў сваёй аснове дуалізм чалавека і прыроды, духу і матэрыі, выяўляла схільнасць аўтара да рамантызацыі гістарычнага мінулага, цікавасць да старажытных беларускіх міфаў і паданняў («Балада», «Вуж», «Лойма», «Азярніцы» і інш.) Творы характарызуюцца моцным вітальным пачаткам, разлічаным на эмпатычнага чытача:

*Блукаюць па зямной паверхні людзі,*
*Іх вочы паўтараюць колер неба:*
*У яснае надвор'е ззяюць сінню,*
*Свінцова-шэрыя — у навальніцу.*
*Але між іх бываюць і такія,*
*Чый колер не мяняецца ніколі.*
*І там, дзе сустракаюцца яны,*
*Наадварот, — святлеюць вочы неба* [1, с. 17].

Адна з першых адметных публікацый у восьмым палымянскім нумары 2010 года сведчыць пра ролю візуальна-вобразнага мыслення ў лірыцы, асноватворчую функцыю дэталі. Трапны вобраз не менш важны ў паэтычным тэксце, чым прыхаваная ў ім філасофская сентэнцыя аб сіле чалавечай індывідуальнасці, здольнай паляпшаць свет. Творчая ж самасць маладога паэта фарміравалася праз выпрабаванні. Слабы з юнацтва на зрок, ён мусіў развітацца з марай стаць мастаком і ўвайшоў у свет літаратурнага мастацтва, дзе «бачаць» свет сэрцам, а адчуваюць — душой:

*Раскаяння слёзы палёгку прыносяць душы...*
*А як жа быць мне? Ты, разумная кніга, скажы,*
*Калі я забыўся, як слёзы салёныя ліць.*



Репозиторий БарГУ

*Няўжо і далей будзе гэтак, як зараз баліць,*
*Калі без вады не прымае раскаяння Бог?..*
*Я морам бязмежным разліўся б, калі б толькі мог!..* [2, с. 98].

Шчырасць лірычнага героя, спакутаванага, але не зняверанага, адрасавана кнізе — крыніцы ведаў. Задаючы «пытанне з пытанняў», ён не чакае адказу. Спадзеў здабыць душэўную раўнавагу руйнуецца безапеляцыйным, але па-філасофску стрыманым «калі б».

Лірыцы У. Чараухіна ўласцівы не толькі філасафічнасць, а і псіхалагізм. У пэўнай меры гэтаму паспрыяла атрыманая ім у ГДУ імя Ф. Скарыны (2017) адукацыя па спецыяльнасці «Псіхалогія. Педагагічная псіхалогія». Прыняцце ўласнай прыроды адбывалася праз разуменне агульнай прыроды чалавека. Праз перасцярогі і страхі (*«Страх — гэта няпройдзеныя дзверы»* [2, с. 90]) усталёўвалася сістэма каардынат, патрэбная для жыцця і творчасці:

*Праз Небыццё — да Абуджэння,*
*Да новых спраў.*
*Брыдзе жыццё да Спасціжэння,*
*Скрозь пекла — ў рай* [2, с. 91].

Лірыка У. Чараухіна прыкметна аўтабіяграфічная, глыбока асабістая. У вершах прасочваецца цесная сувязь жыццёвага досведу аўтара (ён працуе на пасадзе інструктара-метадыста па сацыяльна-працоўнай рэабілітацыі інвалідаў па зроку), яго перажыванняў з агульным культурным асяроддзем. Лірычны герой У. Чараухіна часта з'яўляецца асабовай праекцыяй самога паэта, рэпрэзентуе яго думкі, адносіны да рэчаіснасці, захоўваючы тонкую мяжу паміж творчай выдумкай і рэальнасцю. Аўтарскую прыхільнасць да месца і лакальнай прасторы назіраем, у прыватнасці, у вершах «Азярніцы» і «Сэрца свету». Рэалізм пейзажнага малюнка спалучаецца з адчуваннем персанальнай датычнасці героя да часу і месца дзеяння:

*Альтанка — у воблаках бэзу.*
*Дзівосны куток над ракой.*
*Духмяны вятрыска-гарэза*
*Суквецці варушыць рукой.*
*<...>*
*І толькі паслухай, Танюшка,*
*Пра што шапаціць гэты бэз!..*
*Вось гэтыя ж словы на вушка*
*Шаптаў я калісьці табе* [3, с. 67].

Адносіны з блізкімі людзьмі — важная тэма ў творах паэта, як у «Срэбнай калыханцы», прысвечанай жонцы У. Чараухіна — Дар'і Дарошка. Твор напоўнены трапяткім каханнем і пяшчотай *(«Казытну я промнем мой любімы нос: / — Прачынайся, сонца, я чайку прынёс!»* [3, с. 72]). Вершы-прысвячэнні персаналізуюць зварот да аб'екта пачуцця, ператвараючы перажыванні лірычнага героя ў адрасныя інтымныя пасланні: *«Ты помніш, галубка, калісьці / Быў гэтакі ж сонечны дзень?»* [3, с. 67].

Уплыў класічнай рускай і беларускай паэзіі на творчасць У. Чараухіна заўважны не толькі ў зместавым, але і ў фармальным увасабленні: ён захоўвае прыхільнасць да традыцыйных памераў і рыфмаў, хоць пры гэтым часта эксперыментуе з формай:

*Выматваюць нервы, высмоктваюць сілы*
***Жудасці вілы****.*
*Дзідай упёрся ў спіну пагляд.*
*Страшна спыніцца і азірнуцца назад,*
***На дзверы****.*
*Страшна сустрэцца з насмешлівым позіркам звера*
***Вачыма****.*
*І зусім* ***немагчыма****,*
***Немагчыма****, а трэба,*
*Каб не засціла неба* [2, с. 8].

Перад намі верш, у якім пастаянная рыфма за кошт спецыфічнага падзелу на радкі губляе сваю відавочнасць, саступаючы месца вобразным дамінантам. Апошнія адыгрываюць ключавую ролю ў стварэнні мастацкай выразнасці, канцэнтруючы ўвагу чытача на пачуццёвым плане і цэнтральнай ідэі твора (тут — пераадоленне страху). Між тым счытваецца наяўнасць акцэнтаў, характэрных для трохскладовага памеру.

Цікавыя ідэйна-тэматычныя і фармальныя знаходкі У. Чараухіна ў рэчышчы дысметрычнага верша. Асобна вылучаюцца белыя вершы («Вочы і неба», «Гліна ў руках», «Лілея бялее ў абдоймах зялёнага ценю», «Дождж», «Лютаўскі дождж»), вольныя вершы («Летні дождж», «Верасень у горадзе», «Страх», «Вершнік», «Вецер і мастачка»), верлібры («Алень на вадапоі», «Бэз закаханы ў травень», «На нараджэнне Хрыстова», «Тая, што бяжыць па хвалях», «Яблынька», «Гаспадыня-зіма ў ледзяных завушніцах», «Стомлены вецер у восеньскім парку», «Ліцвінскі пегас»). Паэт выяўляе прыхільнасць да лаканічных, трапных вобразаў, не пазбаўленых, аднак, глыбокага філасофскага зместу:

*Стомлены вецер у восеньскім парку,*
*нібы сівы дворнік у зацёганай світцы,*
*ціхенька пасвістваючы сабе пад нос,*
*мяце па сцяжынках сухою галінкай*
*меднае лісце* [3, с. 89].

Цікавіць творцу і ўсходняя філасофія, уласцівая, у прыватнасці, жанрам японскай паэзіі — танка і хоку: *«Падару букет / Серабрыстых дзьмухаўцоў / Маёй пяшчоты»* [3, с. 8]. А яго перастварэнні на беларускую мову некаторых танка сярэднявечнага японскага паэта Рубока Шо ўяўляюць своеасаблівы культурна-эстэтычны мост паміж усходняй і еўрапейскай традыцыямі («У дзень вясновы», «Блішчыць залатое віно», «Там у гаях» і інш.), паміж мінулым і сучаснасцю. Хоць сама рэцэпцыя ўсходніх жанраў айчыннай мастацкай літаратурай ужо мае пэўную традыцыю (вядомым знаўцам такой паэзіі лічыцца, напрыклад, Алесь Разанаў), яна арганічна ўпісваецца ў актуальную сусветную тэндэнцыю мастацкага дыялогу культур.

Міфалогія і фальклор — яшчэ адна крыніца натхнення для таленавітага гамяльчаніна. Вобразы-ўвасабленні стыхій, духаў прыроды, змрочныя абрысы таямнічых лясоў ствараюць атмасферу таямнічасці, містычнасці. У. Чараухін па-майстэрску аперыруе элементамі міфалагічнага свету, каб перадаць ідэі прыгажосці, небяспекі, трансцэндэнтнасці: *«Гора, о гора табе, чалавек, / Як набрыдзеш ты ў ліхую часіну / На азярніц зарнавокіх мясціну!»* [4, с. 8]. Спалучэнне фальклорных элементаў з трагедыяй чалавечага выбару ўзмацняе драматызм узноўленых абставін. Алітэрацыя і асананс працуюць на стварэнне адпаведнай атмасферы: вершы гучаць як замовы ці песні: *«Россып зіхотак, блішчыць Зорны Кол. / Спіць азярына і пушча наўкол»* [4, с. 8]. Паўтарэнне гукаў **«з»**, **«с»**, **«ш»**, **«ч»** («Ро**сс**ып», «**з**іхотак», «блі**шч**ыць») стварае гукавую ілюзію шэпту, плёскату ўсхваляванай вады. Гук **«п»** («с**п**іць», «**п**ушча») нібы імітуе мяккае, лагоднае закалыхванне. Высокі галосны **«і»**, па кантрасце, як крык начной птушкі, узмацняе атмасферу начной цішыні.

У цэлым вобразы прыроды займаюць ключавыя пазіцыі ў творах У. Чараухіна, асабліва калі выступаюць не фонам, а паўнавартаснымі ўдзельнікамі падзей, як у вершах «Белае і сіняе» альбо «Рыба»:

*Вецер свішча ў скарлючаным голлі,*
*Дрэвы шкрабаюць кіпцямі шыбы,*
*Шыбы ціхенька енчаць ад болю*
*І люструюць зіхоткую рыбу —*
*Круглабокую рыбіну-поўню* [4, с. 8].

Матыў цыклічнасці — быцця і смерці, дня і ночы, сонца і поўні — уласцівы чараухінскаму паэтычнаму стылю. Але ён не вычэрпвае анталагічных зацікаўленняў аўтара. Так, у вершы «Памяць» выяўляецца дадатковы матыў — часовасці, хуткаплыннасці існага. Плынь

Репозиторий БарГУ

часу, параўнаная з працэсам «залатога мыцця», транслюе думку пра важнасць добрых успамінаў, нагадвае пра тое, што чалавек і ёсць нечы ўспамін: *«Прыходзяць людзі і сыходзяць, / І застаецца добры след. / На згадкі багацее свет»* [4, с. 8].

Засяроджанасцю на пытаннях светабудовы тлумачыцца інтарэс аўтара да месца чалавека ў свеце. Менавіта таму аб'ёмны мастацкі абсяг, што спалучае зямное і нябеснае, распасціраецца ўглыб узаемастасункаў асобы і ўніверсуму:

*Ноч разводзіць густое чарніла*
*І малюе бухматыя гронкі,*
*Што ў цямрэчы прасвечваюць міла*
*І насычваюць водарам тонкім*
*Двор заснулы. Над лаўкай альтанкі*
*Гронкі бэзу, як сонмы галактык.*
*У душы нараджаецца танка* [4, с. 8].

У выніку творчы акт як працэс узаемаўплыву знешніх і ўнутраных стымулаў на мяжы свядомага і інтуітыўнага становіцца для суб'екта актам стварэння, самавыяўлення, адкрыцця. У вершы «Навошта мне расплюшчваць вочы» аўтар працягвае разважаць аб супрацьстаянні рэальнага і ўяўнага, даследуючы тэму чалавечага выбару паміж актыўным сузіраннем і пасіўным існаваннем:

*Навошта мне расплюшчваць вочы,*
*Калі я вуліцаю крочу?*
*Дзівак?*
*Але ж вы можаце ісці,*
*Заплюшчыўшы іх,*
*Па жыцці!*
*Як так?* [4, с. 8].

Дарэчы, тэма выбару ў лірыцы У. Чараухіна адлюстроўваецца як экзістэнцыйная дылема: прыроднае (фізічнае) — духоўнае, канкрэтнае — ілюзорнае, перцэптыўнае — неспазнавальнае. Пры гэтым выбар непазбежна фарміруе шлях да самарэфлексіі і гармоніі.

Унікальны жыццёвы досвед творцы, звязаны са стратай зроку, як ні парадаксальна, надаў яго лірыцы асаблівы аб'ём. Адсутнасць візуальнага механізму авалодання рэчаіснасцю ўзмацніла іншыя перцэптыўныя каналы спазнання акаляючага асяроддзя: праз пахі, тактыльныя адчуванні, гукі. Так, у вершы «Шматколернасць» гукі параўноўваюцца з «лёгкімі рукамі», што «бягуць па сцяне» [3, с. 83]. Метафарычнае ўспрыманне гуку як фізічна ўвасобленай з'явы стварае эфект прысутнасці і ўцягненасці ў паэтычны «перфоманс»: тое, што чытач не можа пачуць, ён можа ўявіць пасродкам мастацкіх вобразаў. Так, насычаны тактыльнымі адчуваннямі верш «Лойма»: *«Нячутнай падплыве ступой, / Нахіліцца, кране рукой. / Даткнецца шоўкам валасоў» ці «Сальюцца вусны ў пацалунку, / Грудзей адчую скурай пругкасць»* [3, с. 68].

У паэзіі У. Чараухіна перцэптыўны парадокс адыгрывае апорную функцыю. Ён стварае вобразы, якія размываюць межы паміж рознымі органамі пачуццяў і ўзроўнямі ўспрымання, «уцелясняючы»/адухаўляючы з'явы і аб'екты: *«**Убачу** ў зрэнках, блізка-блізка, / **Цяпла** аранжавыя **блікі**»* [3, с. 68], *«**Чуеш** ты, ці **чуеш** у паветры **смех**, / Лёгкі і празрысты, **быццам срэбны снег?**»* [3, с. 72], ***«Я чую подых цішыні»*** [3, с. 79], *«**Гаворыць душа**, калі вусны маўчаць — / Захоўвай маўчанне і слухай»* [3, с. 72], *«**Знітоўваеш коўдру** з абрывістых **сноў**»* [4, с. 8], *«**Вецер свішча** ў скарлючаным голлі, / **Дрэвы шкрабаюць кіпцямі** шыбы, / **Шыбы** ціхенька **енчаць ад болю**»* [4, с. 8]. Персаніфікуючыся, гэтыя з'явы і аб'екты пераходзяць, паводле М. Хайдэгера [5], у сферу сэнсаў і ўзаемадачыненняў: *«Лютаўскі дождж пазіраў у вялікім здзіўленні / На гразкую глебу, на боты з пушыстым падбоем»* [3, с. 81], *«Праменне струменіць скрозь лісце. / На доле дрыжыць светлацень»* [3, с. 67].

Антрапамарфізацыю прыродных з'яў/аб'ектаў назіраем і ў паэзіі У. Чараухіна для дзяцей: *«Пушысценькія коцікі / Задзерлі ўгору хвосцікі, / <...> / У сэрцайку — жуда!»* [3, с. 91], *«Дробны дождджык галапяты / Скача ў лужыне заўзята»* [3, с. 92], *«Танюшка-лапавушка /*

Репозиторий БарГУ

*Трымае ў жменьках вушкі, / А ўсмешлівы мароз / Куснуў яе за нос»* [3, с. 91]. Праз «ачалавечванне» прыроды аўтар выклікае ў маленькага чытача пачуццё сімпатыі, клопату, цікавасці да акаляючага асяроддзя. Прыём не толькі развівае ўяўленне ў дзіцяці, але і фарміруе эмпатыю, дазваляючы ўспрымаць прыроду як нешта жывое, вартае ўвагі і беражлівых адносін.

Вершы, напісаныя пад псеўданімам ТАТМІР («ТАТьяна + владиМИР»), цікавыя з пункту гледжання калектыўнай творчасці, бо яны ўяўляюць сабой сінтэз двух аўтарскіх галасоў — Таццяны Дарошка і Уладзіміра Чараухіна. Іх лірычны герой звернуты да мікракосму ўласнай душы, праз які ён спазнае і інтэрпрэтуе навакольны свет: *«Не хачу ні спатканняў, ні ружаў, ні кавы. / <...> Я жадаю гуляць пад дажджом і не мокнуць»* [3, с. 123]. Вершы ТАТМІРа — сузіральныя, па-філасофску змястоўныя, лаканічныя: *«У люстэрку ваннай / Пудзіла з нажніцамі. / Аўтабансай»* [3, с. 123]. Паэзія для Дар'і і Уладзіміра, як слушна зазначыў паэт і мастацтвазнаўца Алег Ананьеў, — гэта «форма ўспрымання жыцця», дзе «дзе кожны гук — каштоўнае імгненне: носьбіт інфармацыі, колеру, пачуццяў...» [3, с. 3].

**Заключэнне.** Паэзія У. Чараухіна ўяўляе сабой адметны феномен сучаснай беларускай літаратуры, які спалучае філасофскую глыбіню, лірычную эмацыйнасць, арыгінальную вобразнасць. Паэтычны стыль аўтара заснаваны на сінтэзе асабістага досведу, міфалагічнага мыслення, этыка-эстэтычнага ўспрымання прыроды і чалавека, што ў сукупнасці дазваляе разглядаць яго творы як шматслойны тэкст, звернуты да экзістэнцыйных пытанняў быцця.

Адной з ключавых асаблівасцей чараухінскай паэзіі з'яўляецца перцэптыўны аспект, які выяўляецца ў абвостраным пачуццёвым успрыманні свету. Вершы паэта насычаны сінестэтычнымі вобразамі, што аб'ядноўваюць слыхавыя, тактыльныя і абаняльныя адчуванні. Напрыклад, вобразы святла, ценю, гукаў, тэкстур ствараюць эфект прысутнасці: чытач не толькі бачыць, але і адчувае мастацкую прастору праз прызму ўспрымання лірычнага героя. Нярэдка зместавыя знаходкі спалучаюцца з фармальным эксперыментам.

Паэзія беларускага творцы ўздымае пытанні быцця, мінучасці, кахання, прыгажосці і інш. Яго лірычны герой — адначасова сузіральнік і мысляр, які шукае гармонію паміж унутраным і знешнім. Прырода ў вершах У. Чараухіна становіцца крыніцай метафар чалавечых пачуццяў, філасофскіх ідэй, ілюструе сувязь суб'екта з пэўнай культурнай парадыгмай. Вобразы дрэў, вады, зорак і інш. набываюць сакральнае значэнне, злучаючы мікракосм душы з макракосмам Сусвету, і становяцца праваднікамі містычнага досведу.

Дзіцячая паэзія У. Чараухіна вылучаецца лёгкасцю, дасціпнасцю. У забаўляльнай форме яна спрыяе фармаванню ў дзяцей эмпатыі, фарміруе эстэтычны погляд на свет. Прастата мовы і вобразаў у вершах для дзяцей гарманічна спалучаецца з іх глыбокім выхаваўчым патэнцыялам. Творчасць У. Чараухіна на рускай і беларускай мовах сведчыць, з аднаго боку, аб яе ўніверсальнасці, а з другога — аб укаранёнасці ў нацыянальнай лінгвакультуры.

Калектыўная творчасць У. Чараухіна і Т. Дарошка пад псеўданімам ТАТМІР — сінтэз двух аўтарскіх светаў, што спрыяе дыялагічнасці тэкстаў і шматграннасці іх інтэрпрэтацыі.

Рэпазіторый БарДУ

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Чараухін, У.* Вочы і неба / У. Чараухін // Полымя. — 2010. — № 8.
2. *Чараухін, У.* Пытанне з пытанняў / У. Чараухін // Полымя. — 2014. — № 2.
3. *Дарошка, Д.* Альтанка : вершы, проза / Д. Дарошка, У. Чараухін. — Мінск : Кнігазбор, 2017. — 140 с.
4. *Чараухін, У.* Вершы / У. Чараухін // Літаратура і мастацтва. — 2023. — № 23.
5. *Хайдеггер, М.* Время и бытие : Статьи и выступления / М. Хайдеггер ; пер. с нем. В. В. Бибихина. — М. : Республика, 1993. — 447 с.


Паступіў у рэдакцыю 16.12.2024.